# Роля еўрапейскай адукацыі ў кар'еры магнатаў Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.

*Калтачэнка А. І., асп. РІВШ,*
*навук. кір. Любы А. У., канд. гіст. навук, дац.*

Атрыманне адукацыі ва ўніверсітэтах Еўропы сярод магнацкіх сем'яў Вялікага Княства Літоўскага распачалося яшчэ ў XV ст., а найбольшы росквіт прыйшоўся на канец XVI – першую палову XVII ст. Часцей за ўсё адукацыйныя падарожжы разглядаліся магнатамі Вялікага Княства Літоўскага не як магчымасць атрымаць навуковыя ступені, а як спосаб авалодання практычнымі ведамі, неабходнымі для выканання грамадскай службы.

Адукацыя мела своеасаблівы характар, адметнымі рысамі якога з'яўляліся: наведванне толькі абраных лекцый, навучанне ў форме прыватных урокаў, акцэнтаванне на вывучэнні замежных моў і ваеннага вопыту. Акрамя таго, вялікае значэнне надавалася завязванню кантактаў у сферах арыстакратычных, княжацкіх і каралеўскіх двароў, далучэнне да палітычнага і культурнага жыцця. Усё гэта дазваляла маладым людзям ведаць не толькі замежныя мовы і рыторыку, але і рыцарскую справу, добра арыентавацца ў палітыцы і ваенным мастацтве.

Спачатку замежную адукацыю атрымоўвалі толькі магнаты. Звязана гэта было з вялікімі выдаткамі падчас навучання. Так, акрамя платы за навучанне, жыллё і розныя забавы, магнаты жылі вельмі насычаным грамадскім жыццём, якое патрабавала велізарных грошай і лічылася важнай часткай навучання. Але ж усе выдаткі акупаліся ў будучым, калі атрыманыя веды прыносілі поспех. Паступова і шляхта пачала разглядаць замежную адукацыю сваіх сыноў як адну з найбольш дасканалых магчымасцей зрабіць паспяховую ваенную альбо службовую кар'еру. Зразумела, што факт навучання ў Еўропе не гарантаваў атрымання высокіх пасад, але павялічваў шансы на гэта.

Адной з магнацкіх сем'яў, што звярталі на адукацыю вялікую ўвагу, былі Радзівілы. На прыкладзе некалькіх прадстаўнікоў гэтага роду прасочым ролю вышэйшай адукацыі ў іх жыцці і кар'еры.

Так, Януш (1612–1655) і Крыштаф II Радзівілы (1585–1640), сыны Крыштафа Мікалая Радзівіла Перуна, атрымлівалі веды ў некалькіх еўрапейскіх навучальных установах. Акрамя таго, мелі вайсковую адукацыю, Януш наведваў Парыжскую рыцарскую акадэмію, а Крыштаф – лагер прынца Морыца Аранскага ў Хертогенбосе. З грунтоўнай адукацыяй, з веданнем у тэорыі і на практыцы розных методык вядзення вайны, яны здолелі ў меру гарманічна спалучаць заходне- і ўсходнееўрапейскае ваеннае мастацтва [1].

Нягледзячы на тое, што ў гісторыі гэтыя прадстаўнікі роду не вызначыліся нечым надзвычайным, іх уменні дазволілі дасягнуць значных ваенных поспехаў і праславіць армію Вялікага Княства Літоўскага за межамі краю. Трэба адзначыць, што іншыя вялікія гетманы мелі шматгадовы вайсковы вопыт, але значна саступалі Радзівілам, бо не заўсёды мелі веды па камандаванні вялікім і разнародным войскам [1].

Добрым прыкладам можа быць і іншы прадстаўнік роду Радзівілаў – Міхал Казімір Радзівіл (1635–1680). Палітычная кар'ера якога пачалася ў 1652 г. і склалася вельмі добра: стольнік (1652), крайчы (1653), падчашы (1656), кашталян (1661), гетман польны літоўскі (1668). Князь быў паспяховым ваенным дзеячам, праявіў выдатныя здольнасці ў бітве з туркамі пад Хацінам 11 лістапада 1673 г., у ваеннай кампаніі лета-восені 1675 г. і інш. І калі ў канцы 70-х гг. адбылася пераарыентацыя знешняй палітыкі краіны, выкліканая нарастаючай турэцкай пагрозай, Міхал Казімір з жонкай адправіліся ў падарожжа з паўафіцыйнымі візітамі ў Вену, Венецыю і Рым. Мэты гэтыга падарожжа не былі дасягнуты, аднак пэўныя знаёмствы і кантакты ў Італіі спрашчалі яго місію [2].

Трэба адзначыць, што і сыны Міхала Казіміра Радзівіла, Караль Станіслаў (1669–1719) і Ежы Юзаф (1680–1689), падчас свайго адукацыйнага падарожжа выконвалі пэўныя дыпламатычныя заданні Яна III Сабескага.

Калі разглядаць адукацыю сярэдняй і дробнай шляхты, то яе прадстаўнікі ставіліся да вучобы больш адказна і зацікаўлена. Большасць уладальнікаў навуковых ступеняў бакалаўраў, магістраў, дактароў паходзіла з гэтых слаёў, бо поўная ўніверсітэцкая адукацыя адкрывала пэўныя перспектывы дваровай, адміністратыўнай, царкоўнай кар'еры [3].

Падводзячы вынік, варта адзначыць, што еўрапейская адукацыя адыгрывала значную ролю ў жыцці арыстакрата, бо давала шанец не толькі пабудаваць паспяховую кар'еру ў княстве, але і заняць бачнае месца пры дварах еўрапейскіх манархаў. Прадстаўнікі магнацкіх сем'яў імкнуліся атрымаць не поўную ўніверсітэцкую адукацыю, а асобныя карысныя веды і знаёмствы, а прадстаўнікі сярэдняй і дробная шляхты разглядалі вучобу як перспекрыўны кар'ерны крок.

## Літаратура

1. Рахуба, А. Узброеныя сілы Вялікага Княства Літоўскага ў XVII стагоддзі / А. Рахуба // ARCHE. Срэбны век. – 2015. – № 12. – С. 17–54.

2. Петшак, Я. Радзівілы ў Вялікім Княстве Літоўскім у першае дзесяцігоддзе панавання Яна III Сабескага / Я. Петшак // ARCHE. Срэбны век. – 2015. – № 12. – С. 112–142.

3. Галенчанка, Г. Адукацыя, універсітэты, падарожніцтвы ў XVI–XVII стст. / Г. Галечанка // Бібліятэка гістарычных артыкулаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://jivebelarus.net/culture/education-and-traveling-in-16-17-century.html#lnk2. – Дата доступа: 05.04.2020.

## Establishing independence of the First Slovak Republic

*Кандраценка А. С., асп. БДУ*
*навук. кір. Козік Л. А., канд. гіст. навук, дац.*

The public and political life of the Slovak people in the early 20th century underwent significant changes. The collapse of the Austro-Hungarian Empire led to the creation of new States on its remnants. After the First World War, new historical conditions were created for the realization of national ambitions in the form of the creation of national States. Slovak policymakers decided to join the Czech-Slovak State.

The Martin Declaration, adopted on October 30, 1918, by representatives of all Slovak political parties outlined the decision to create a unified Czech-Slovak State [5]. However, the implementation of this idea was a difficult task. At the end of the First World War Hungary sought to keep the territory of Slovakia within its borders, promising its inhabitants autonomy. Nevertheless, the Slovaks had a negative experience of existence with the Hungarians in the Austrian Empire, and later in Austria-Hungary. For this reason, Slovak politicians supported the idea of creating a Czech-Slovak State, as they saw it not only as a Union of the two Slavic nations, but also as a protection from Hungarian expansion. The next two years were spent in the struggle of Czechs and Slovaks for Slovakia, as Hungary refused to recognize the secession of Slovak lands from its jurisdiction. And only on June 4, 1920, according to the Treaty of Trianon concluded between the Entente and Hungary, the latter abandoned claims on Slovakia and Subcarpathian Ruthenia in favor of Czechoslovakia [1, p. 102–103].

The foundations of the state structure of the Czechoslovak Republic were laid by the new Constitution of 1920. Its preamble established the concept of the Czechoslovak people as a single state-forming nation. Czechoslovakia delivered as a centralized unitary State with its capital in Prague. The Constitution provided for autonomy only for Subcarpathian Ruthenia [7]. Czech politicians in drafting the Constitution moved away from the Pittsburgh agreement, which included a broad scope of self-government for Slovakia, and used the Cleveland agreement, which made no mention of autonomy for Slovaks.